# ЗЯМНОЕ — КАСМІЧНАЕ Ў ПАЭЗІІ ЯНКІ КУПАЛЫ

Сусвет здаўна вабіў, клікаў да сябе чалавека, які сваёй думкай імкнуўся ахапіць неабдымныя, неабсяжныя прасторы, пранікнуць у нетры таямнічага космасу. Да асэнсавання прыроды і звязаных з ёй аб'ектаў, стыхій падключылася міфасвядомасць, якая дае хоць і спецыфічнае, але глабальнае бачанне свету. Неспазнанае бязмежжа, звышнатуральнае, нават містычна-чароўнае (напрыклад, зацьменне сонца ці метэарытавы дождж) абуджалі фантазію чалавека, у якога складваліся ўяўленні пра сувязь зямлі і неба. Нярэдка гэта было эмацыянальна-вобразнае, наіўна-казачнае тлумачэнне свету, аднак па-свойму прыгожае і вельмі паэтычнае. Старажытная касмагонія яскрава адбілася ў астральных і салярных міфах, легендах, замовах і іншых фальклорных творах, дзе ўвасоблены нябесныя з'явы, касмічныя аб'екты. У гэтай сувязі слушна адзначаецца, што «ўсю суму ўяўленняў пра Космас і Зямлю нашы продкі абагульнялі ў выглядзе нейкай канкрэтнасці — мадэлі», а «міфапаэтычная мадэль свету заўсёды выключна гарманізаваная: усё зямное ў ёй звязана з Космасам, выводзіцца з яго, аб'яднана пэўнымі касмічнымі законамі» (Т. Шамякіна). Пачынаючы з антычнасці (Геракліт, Гесіёд і інш.) і да XX стагоддзя, якое вядома тэорыямі і вучэннямі А. Эйнштэйна, К. Цыялкоўскага, У. Вярнадскага, П. Фларэнскага і інш., выказваліся погляды на ўладкаванне свету і наша існаванне ў міжпланетнай прасторы.

Зорны сусвет будзіў творчую думку пісьменнікаў і мастакоў розных эпох. Ужо Ф. Скарына, тлумачачы старонкі Бібліі, скіроўваў да пазнання светабудовы, сэнсу існавання пад вечным небам. Беларускія творцы, дзякуючы сіле мастацкага ўяўлення, абжылі і ачалавечылі сусвет. Уражваюць, да прыкладу, сваёй прагнастычнай смеласцю фантазіі мастака Я. Драздовіча ці паэта А. Куляшова, увасобленыя ў іх творах задоўга да надыходу касмічнай эры. Калі чытаеш вершаваныя радкі М. Багдановіча з запытаннем «Нашто ж на зямлі // Сваркі і звадкі, боль і горыч, // Калі ўсе мы разам ляцім // Да зор?», то пераконваешся ў слушнасці таго, што пазней сказаў У. Вярнадскі пра чалавека як суб'екта касмічнага быцця: «Чалавек упершыню рэальна зразумеў, што ён жыхар планеты і можа— павінен— мысліць і дзейнічаць... у планетным аспекце» («Размышления натуралиста»). Я. Купала — адзін з першых беларускіх паэтаў, чый позірк быў прыкаваны «к зорам агністым, к прыволлю нябеснаму» («К зорам»). Ён не толькі шматаблічна ўвасобіў нацыянальны свет, але і выявіў маштабнасць пейзажнага мыслення, узняўся да філасофскага касмізму. Яго цікавіла ўзаемасувязь і ўзаемазалежнасць зямнога і нябеснага жыцця.

Касмізм і маштабнасць думкі сучаснай паэзіі шмат у чым абумоўлены першаадкрыццямі Я. Купалы. Менавіта ён як паэт з раскаваным позіркам на свет адлюстраваў краявіды з кінематаграфічнай аб'ёмнасцю, панарамна, а яшчэ — гіпербалізавана і сімвалічна. Сваім зрокам і пачуццём Я. Купала шырока ахапіў прасцягі беларускай зямлі («Я тут бачу свой край: рэчку, поле і бор...»), ракурс яго светабачання па-сапраўднаму касмічны: «Мой дом — прыволле зёзднай далі, // арламі мераны абшар...» («Мой дом»). Сусвет для паэта — зямля і неба ў іх непарыўнай цэласнасці, родны і блізкі дом. У яго творчасці выяўляецца паэтычны культ сонца. Пра купалаўскі вобраз сонца можна гаварыць у суаднесенасці з даўняй касмаганічнай карцінай свету, дзе нябесная святланосная энергія — вышэйшая сіла жыцця. Я. Купала паэтызуе гэтае галоўнае нябеснае свяціла з адухоўленасцю, узвышана, успрымае як штосьці высокае, ідэальнае, вечнае, што сімвалічна ўвасабляе сабой такія маральна-духоўна-філасофскія катэгорыі, як праўда, шчасце, свабода, ісціна, справядлівасць: «І праўда возьме верх нязводне: // Такі ўжо сонца вечны ход» («Апекунам»). Вось чаму паэт імкнуўся разам са сваім заняволеным, пагарджаным народам вырвацца «к яснаму сонцу з цьмы, з беспрасвецця...» («З кутка жаданняў»). У паэтычным мысленні Я. Купалы відавочная бінарная апазіцыя «сонца — цемра» («Сонца з цемрамі змагаецца...»), і гэтая антыномія сведчыць пра адвечнае змаганне светлага і змрочнага пачаткаў у сусвеце. Паэт пастаянна

апелюе да сонца і зорак як субстанцый нейкага разумнага універсуму, боскага і мудрага светаўладкавання. Сонца для Купалы, асабліва вясновае і купальскае, сімвалізуе само духоўнае адраджэнне народа, без яго ён не ўяўляе Беларусі і яе будучыні:

Клічам, сонца, цябе як адзін!
-----------------------------------
Як у свята купальскае, сонца,
Свой жывы абнаўляеш паглёд,
Аднаві славу нашай старонцы,
Аднаві яе сумны народ!
(«Песня сонцу»)

Спалучаючы зямное і высокае, гарызанталь і вертыкаль, паэт дасягае геакасмічнага светаразумення, інакш кажучы, разглядае родную зямлю як сакральную частку сусвету. Беларусь і яе быццё звязваецца ва ўяўленні паэта з вышэйшай духоўнай сферай: «З сонцам злучыся, зорамі йскрыся...», «Хорам твой — неба і нівы краса...»(«Выйдзі...»). Сонцаў Купалы жыццядайнае і жыццятворнае, яно «полымем вызвала к слаўнай сяўбе», абудзіла «думы заспаныя». Маладая Беларусь асацыіруецца з самім сонцам, яна бачыцца паэту ў сонечна-зорным убранні — дзівосным, незвычайным, казачным: «З зорак усходніх, заходніх, з бліскучай// маланкі выткаў бы шаты, // З сонца і кветак-пралесак карону // вяночак звіў бы табе я»; «Воблачак зняў бы на трон з небасклону, // з-пад сонца пышны, багаты» («З зорак усходніх, заходніх, з бліскучай...»). Паэт услаўляе сонечны дзень, сонечную Бацькаў-шчыну: «Смела ў сонцы ідзеш, як жывы агняцвет; // Сееш ласкава сны залацістыя...» («Маладая Беларусь»: «Вецер вольны напеў вольных песень табе...»). Я. Купала з аптымізмам сцвярджае ідэю сонечна-прасветленага быцця на зямлі — быцця, пазбаўленага цемры, уладкаванага па законах гармоніі і прыгажосці:

Самое сонца ўзяць у рукі
І, як з паходняй, з ім ісці.
Святлом ніштожыць нашы мукі,
Увесь плач роднае зямлі.
(«Прыстаў я жыць...»)

Паэт стварыў высокі салярны культ Беларусі. Можна сказаць, што ён абагаўляе сонца, якому складае песні-гімны і малітвы.

Для хранатопу ў вершах, у якіх выяўляецца касмічны ракурс светаадлюстравання, характэрна міфалагічная ўключанасць «я» аўтара ў прастору і прыроднае быццё. У нябесных свяцілах паэту бачацца жывыя, адухоўленыя істоты, якія дзякуючы прыёму антрапамарфізму, набываюць уласцівасць думаць і адчуваць. Гэтыя нябесныя істоты-персанажы здольны паспрыяць у штодзённым жыцці, засцерагчы, абараніць чалавека ці паспагадаць яму. Для Купалы «Сонца, Месяц і Зоркі, — кажучы словамі А. Афанасьева, — пільныя нябесныя вартавыя, ад вачэй якіх ніхто не схаваецца»:

«Ты, ясна сонца, месяц, ясен свет,
І вы, на небе часценькія зоры,
Вы ўсе, што кропіце расою цвет
І асвятляеце сушу і моры, —
Зямлю агрэйце, вырасцце траву,
Не пашкадуйце есць і піць жывінам,
Шаўковую сцяліце мураву,
Абгарадзіце жалязяным тынам...»
(«Яна і я»)

У народным духу, на міфапаэтычны лад нябесныя сілы заклікаюцца паэтам да лучнасці з Зямлёй, каб гэтая еднасць паспрыяла гарманічнаму ўладкаванню жыцця і свету. Купалаў герой пад сонцам, небам, Млечным Шляхам жыве рамантычнай думкаймарай пра чалавечае шчасце, жадае, каб і далёкія зоркі, нябесныя свяцілы зрэагавалі на малітвы і просьбы, прычыніліся да зямных спраў, пазначылі іншы лёс беларусам і роднаму краю. Герой Купалы паўстае як асоба велічна-рамантычная, якая лучыцца «са святламі бязмежна ўсясвету» і «аглядае міры» («Песняй толькі»). Думка паэта ўзбуйняецца, набывае глабальны характар і маштабнасць. Ён, паядноўваючы розныя планы — гарызантальны і нябесна-касмічны, стварае разгорнутую метафару зямнога быцця: «Млечны Шлях, што нябесны дзядзінец // Засцілае, я б зняў на зямлю //І масціў бы ім новы гасцінец // Цераз родную ніву сваю», «Сонца ўзяўшы агністае ў рукі, // што гарыць над бязмерам палёў, // Я па Млечным тым Шляху без мукі // Чалавека да шчасця бы вёў» («Песняй толькі»). Я. Купала, нягледзячы на гіпербалізацыю вобраза чалавека, не займаў пазіцыю антрапацэнтрызму. Паэт узвышае чалавека, аддае належнае «думнаму цару зямлі», не абмяжоўвае яго магчымасці ў спазнанні сусвету, гаворыць, што той «...неба ўсе скрыткі падгледзеў: // Злічыў, колькі зор, што ёсць на іх...» («Чалавеку»). Купала, аднак, перакананы, што «гэтых сіл» сусвету не перасягнуць чалавеку, ён павінен быць у пастаянным духоўным пошуку: «...Аб роднай старонцы пытайся // Ты неба, зямлі і жыцця» («Сэрца спытай...»). Я. Купала сцвярджае філасофскую ідэю Зямлі-Беларусі як вызначальнай у вялікім сусвеце. На гэткіх жа геацэнтрычных пазіцыях стаіць і рускі паэт В. Брусаў: «Я — сын земли, дитя планеты малой, // Затерянной в пространстве мировом»; «Я — сын земли, где дни н годы кратки, // Где сладостна зеленая весна, // Где тягостны безумных душ загадки...» («Сын землн»). «Эдэмам вечным» лічыць сваю зямлю В. Брусаў, адзінай, непаўторнай і райскай паўстае родная зямля з твораў Я. Купалы: «Зямлі і сонцу нізка пакланюся — // Я — сын зямлі і сонца вольны сын!» («Вечар»). Лірычны герой паэта паўстае як чалавек сонца і зямлі, у яго ўяўленні іх сувязь адвечная і непарыўная. Падобнае светаадчуванне выявілася ў «Слове аб палку Ігаравым», дзе «адносіны да Сонца спалучылі ў сабе пачуццё сусвету і пачуццё зямлі, непадзельна з'яднаныя паміж сабой» (Я. Асятроў). Дзеля таго, каб родная зямля пазбавілася пакут, гора, сышлі з яе «чорныя долі з мяцеліцаў шумамі», беларускі пясняр прамаўляе прачулыя словы малітвы: «Я буду маліцца да яснага сонейка...», «Я буду маліцца да зорак і жаліцца...» («Мая малітва»: «Я буду маліцца і сэрцам, і думамі...»); «Малюся я небу, зямлі і прастору, // Магутнаму Богу — Ўсясвету малюся...» («Мая малітва»: «Ва ўсяку мінуту, ва ўсякай патрэбе...»). Думкай паэт Узносіцца да сонца як ідэалу зямнога быцця: «Ды ў свет зноў за сонцам, за новай зарой!» («Мая думка»).

Сімвалам паяднання зямнога і нябеснага выступае ў паэзіі Я. Купалы вобраз дрэва, якое аб'ядноўвае свет-зямлю і касмічную сферу. Так, явар выступае як частка не толькі канкрэтнай мясціны, але і вялікага свету: «.. .Быў ён князем гэтых ніваў, // На ўсім свеце меў павагу», «… І ківае галавою, // Ўсё ківае ў свет далёкі» («Явар»). Явар і каліна спраўляюць «модлы пакорныя з маткай-зямлёй» і «тайна ў ночаньку чорную месяца, зор выглядаюць» («Явар і каліна»). Купала надзяляе дрэвы незвычайнымі ўласцівасцямі, яны з'яднаны з нябесным светам, самой вечнасцю. Разам з тым ім пасылаюцца «неба... непрыветы», «неба помсты» (вершы «Вольха», «Дзве таполі» і інш.). Праз «касмічную» падсветку паэт увасабляе канцэпцыю жыцця-існавання дрэва, пры гэтым досыць часта прачытваецца аналогія з чалавечым лёсам. У вершы «Груша» ён стварае мадэль сусветнага дрэва: «Калышацца сталетняя, // Шуміць на ўсе староны, // На ёй галінаў тысячы, // Ліསткоў на ёй мільёны», «.. .Шуміць, заходзе ў гутарку // То з небам, то з зямлёю». Дрэва, як і чалавек, трымаецца сваёй роднай глебы, хоць яго вабіць вышыня нябёсаў.

Я. Купала з захапленнем і замілавана-пяшчотна ставіцца да зорак. З імі паэт звязвае самае дарагое і запаветнае. Зорнае неба — пастаянны аб'ект Купалавага светасузірання. Для беларускага песняра, як і для нямецкага філосафа І. Канта, — гэта вечная суб-

станцыя, найвялікшая духоўная каштоўнасць: «Неба свой нямы сход: месяц, зор харавод // Над зямлю то выводзіць, то зводзіць...» («Ноч за ночкай»). Уяўленні Купалы пра зоркі звязаны з народнымі міфапоглядамі, таму гэтыя нябесныя свяцілы персаніфікуюцца, паўстаюць дзейнымі персанажамі сусветнай містэрыі. Зорнае неба таямнічае і загадкавае, адтуль сыходзіць на зямлю святло Боскай існасці. Адсутнасць зор на небе прадвяшчае беспрасветнасць і цяжар зямнога існавання (верш «А як мы з хаткі выходзім...»). Менавіта касмічная праекцыя дае магчымасць выразней убачыць рэальны «ландшафт жыцця». Зорнае неба як увасабленне духоўнай вышыні і маральнай чысціні быццам момант ісціны для чалавека і грамадства. Я. Купала і В. Брусаў правяраюць жыццёвую рэальнасць, праводзячы паралель паміж нябесным і зямным светам: «З зораў, з-пад неба ўсё быццe зямельнае // Проймеш паглядам цікавым наскрозь; // Бачыці будзеш — з жыццём нераздзельныя — // Крыўду, бяспуцце, нянавісць і злосць» («К зорам»); «Пусть новый мир встает из бездн безвестных, // Не знающий, что в прошлом были мы: // О нем мечтаю, в свете звезд небесных...» («Когда смотрю в декабрьскнй сумрак ночи...»). Зорнае неба — святыня, крыніца духоўнай энергіі, якая дае моц, каб супрацьстаяць жыццёвым выпрабаванням і нягодам: «Зоры веру ўлілі сілам зломаным» («Маладая Беларусь»). З небам Я. Купалу спалучае тонкая і глыбокая духоўная сувязь. Неба і зямля паўстаюць для яго ў гарманічным адзінстве: «З зямлёй і небам звязывае мяне ніць — // Неразарваная веквечна пуціна: // Зямля мяне галубіць, як вернага сына, // А сонца мне душу не кідае туліць» («Бацькаўшчына»). Ён апелюе да Усявышняга, Бог для паэта велічны і ўсёмагутны — «цар і неба, і зямлі». Ва ўспрыманні светабудовы відавочны тэацэнтрызм Я. Купалы: «Вачамі сонейка і зор агністых // Агляд Ты робіш дзень і ноч міроў...» («Цару неба й зямлі»).

Такім чынам, Чалавек і Сусвет — гэта каштоўнасны цэнтр філасофска-паэтычнага светаразумення Я. Купалы. Як і герой Гусляр з аднайменнай паэмы, паэт адчувае сябе неад'емным суб'ектам сусветнай прасторы-быцця: «Небу справу здае сэрца, думка мая, // Сонцу, зорам, арлам толькі роўна» («Курган»). Паміж сонцам, зоркамі і ўнутраным светам паэта існуе тонкая эмацыянальна-адухоўленая сувязь, якая красамоўна сведчыць пра гарманічнае адзінства з прыродай. Засяроджанасць на нябесных вобразах і краявідах, якія набываюць сімваліка-філасофскае ўвасабленне, — гэта па сутнасці заглыбленасць Купалы ў жыццё, быційныя і вечныя пытанні чалавечага існавання. Мадэль сусвету ў яго паэзіі — сінтэз мікра- і макрааб'ектаў ды рэалій, трывалае паяднанне зямнога і касмічнага. Геакасмізм Я. Купалы — гэта маштабнасць светабачання і светаразумення, пазнавальны рух думкі да сутнасці касмічна-зямнога быцця ў цеснай суаднесенасці з эстэтычным пачаткам у паэтычнай вобразатворчасці.

**Бельскі, А. І.**

Зямное – касмічнае ў паэзіі Янкі Купалы / А. І. Бельскі // Галасы і вобразы : літаратурна-крытычныя артыкулы / А. І. Бельскі. — Мінск : Литература и искусство, 2008. — С. 5—11.